Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой праграмы “Сучасная беларуская мова”:Вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях 1-21 05 01 “Беларуская філалогія”, 1-21 05 02 “Руская філалогія”, 1-21 05 04 “Славянская філалогія”, 1-21 05 05 “Класічная філалогія”, 1-21 05 06 “Рамана-германская філалогія” / Аўт.-склад. З.І.Бадзевіч, С.А.Важнік, Г.К.Чахоўскі. – Мн., РІВШ, 2010. Зацерджана Вучэбна-метадычным аб’яднаннем ВНУ Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі 13.07.2010 г. Рэгістрацыйны № ТД – Д 133/ тып.

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння на пасяджэнні кафедры
_________________ сучаснай беларускай мовы ____________________
(назва кафедры)

11 чэрвеня 2012 г. Пратакол №11

(дата, нумар пратакола)

Загадчык кафедры
_________________ З.І. Бадзевіч
(подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння Вучэбна-метадычнай камісіяй філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(назва вышэйшай навучальнай установы)

21 чэрвеня 2012 г. Пратакол № 8
(дата, нумар пратакола)

Старшыня
_______________ М.М. Хмяльніцкі
(подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)

# Тлумачальная запіска

Вучэбны курс  сучаснай беларускай мовы, звязаны з вывучэннем раздзелаў “Марфеміка. Марфаналогія. Словаўтварэнне”, з’яўляецца важным звяном у фарміраванні лінгвістычнай кампетэнцыі студэнтаў-філолагаў, спрыяе вырашэнню задачы гісторыка-культурнага асваення моўнай спадчыны беларускага народа.

Вывучэнне раздзелаў “Марфеміка. Марфаналогія. Словаўтварэнне” ставіць сваёй задачай авалоданне лінгвістычнай тэорыяй па марфеміцы, марфаналогіі  і словаўтварэнні, выпрацоўку ўменне аналізаваць марфемную і словаўтваральную структуру лексічных адзінак рознага тыпу -- вытворных/невытворных, простых/складаных.

Засваенне марфемікі і словаўтварэння мае на мэце падвесці студэнтаў да разумення прычынна-выніковых сувязей у мове, да асэнсавання таго, што словаўтваральная сістэva – частка агульнай сістэмы мовы, усе элементы якой знаходзяцца ва ўзаемасувязі.

У працэсе  вывучэння марфемікі і словаўтварэння студэнты павінны ведаць:

- тыпалогію адзінак марфемікі, марфаналогіі і словаўтварэння, іх значэнні і функцыі;
- азначэнні паняццяў марфемікі, марфаналогіі і словаўтварэння;
- істотныя прыметы марфеміка-словаўтваральных з’яў;
- спосабы форма-словаўтварэння;
-комплексныя адзінкі словаўтварэння, іх дыферэнцыяльныя і інтэгральныя прыметы;
-сэнсава-стылістычную функцыю форма-словаўтваральных сродкаў;
- сувязь марфемікі і словаўтварэння з іншымі раздзеламі мовазнаўства;
- лінгвістычныя трактоўкі да пэўных прыватных з’яў па марфеміцы і словаўтварэнні, іх навуковае асвятленне.

Павінны ўмець:

- выдзяляць значымыя часткі ў словах і тлумачыць іх;
- адрозніваць формаўтварэнне і словаўтварэнне;
- падбіраць аднакаранёвыя і аднаструктурныя словы паводле фармальна-семантычных сувязей;
- вызначаць спосабы ўтварэння слоў;
- мадэліраваць паводле фармальна-семантычных сувязей розныя адзінкі словаўтварэння (словаўтваральныя пары, словаўтваральныя ланжужкі, словаўтваральныя тыпы, словаўтваральныя гнёзды, словаўтваральныя парадыгмы);
- выкарыстоўваць вытворныя словы і формы слоў у вусным і пісьмовым маўленні;
- утвараць вытворныя ў адпаведнасці са словаўтваральнымі нормамі; іх рэдагаванне ў выпадку неадпаведнасці словаўтваральнай норме (словаўтваральнай мадэлі, словаўтваральнаму тыпу);
- праводзіць марфемны і словаўтваральны аналіз слоў;
- карыстацца марфемнымі і словаўтваральнымі слоўнікамі.

Вывучэнне курса “Марфеміка. Марфаналогія. Словаўтварэнне” павінна садзейнічаць паляпшэнню якасці арфаграфічных уменняў і навыкаў студэнтаў, імкненню да самастойнага назапашвання ведаў, фарміраванню духоўна арыентаванага мыслення і высокага інтэлекту.

## Праграма вучэбнага курса

## МАРФЕМІКА

Марфеміка: тэрмін і паняцце. Двузначнасць тэрміна марфеміка. Марфеміка як раздзел мовазнаўства, яе прадмет і задачы. Сувязь марфемікі з іншымі раздзеламі мовазнаўства (фанетыкай і фаналогіяй, лексікалогіяй, словаўтварэннем, марфалогіяй, сінтаксісам). Асноўныя паняцці марфемікі.

Марфеміка як сістэма марфем мовы. Марфема як мінімальная значымая частка слоў (словаформ). Месца марфемы ў сістэме адзінак розных узроўняў мовы: фанема і марфема, склад і марфема, слова і марфема, словазлучэнне і марфема, сказ і марфема. Агульныя (інтэгральныя) і адметныя (дыферэнцыяльныя) прыметы марфемы ў параўнанні з іншымі адзінкамі мовы.

Сістэма марфем у мове. Класіфікацыя марфем паводле іх ролі, значэння, функцыі, месца ў складзе слова (словаформы) і паходжання. Каранёвыя і афіксальныя марфемы, іх асаблівасці і адрозненне. Свабодныя і звязаныя (радыксоіды) карані. Фармальна-семантычнае вылучэнне каранёвых марфем. Цяжкія выпадкі вылучэння каранёвых марфем.

Афікс: тэрмін і паняцце. Класіфікацыя афіксальных марфем паводле месца ў складзе слова (словаформы) адносна кораня: перадкаранёвыя і паслякаранёвыя афіксальныя марфемы. Характарыстыка афіксальных марфем: прэфікс (прыстаўка), суфікс, постфікс, інтэрфікс, конфікс (цыркумфікс), флексія (канчатак). Пытанне аб інтэрфіксах, постфіксах і конфіксах (цыркумфіксах) у лінгвістычнай літаратуры.

Класіфікацыя афіксальных марфем паводле значэння і функцыі: словаўтваральныя (дэрывацыйныя), формаўтваральныя (словазменныя, рэляцыйныя) і словаформаўтваральныя (сінкрэтычныя) афіксы.

Рэгулярныя і нерэгулярныя, прадуктыўныя і непрадуктыўныя афіксы.

Афіксоіды як марфемы пераходнага тыпу. Разнавіднасці афіксоідаў: прэфіксоіды, суфіксоіды. Пытанне пра афіксоіды ў сучаснай лінгвістыцы.

Структурна-семантычныя ўзаемаадносіны афіксальных марфем у складзе слова. Аманімія, полісемія (мнагазначнасць), сінанімія і антанімія марфем.

Экспрэсіўна-стылістычныя функцыі марфем у беларускай мове.

Тыпы афіксальных марфем паводле фанемнага выражэння: матэрыяльна выражаныя (пазітыўныя) і нулявыя марфемы. Нулявыя марфемы і спосабы іх вылучэння ў словах (словаформах).

Адзінкавыя (унікальныя) структурныя часткі слоў (словаформаў), іх уласцівасці. Унірадыксоіды і уніфіксы.

Парадыгматычны і сінтагматычны спосабы вылучэння афіксальных марфем. Цяжкія выпадкі вылучэння афіксальных марфем.

Аснова: тэрмін і паняцце. Аснова як абавязковы кампанент структуры

слова. Прынцыпы выдзялення асновы слова і асновы словаформы ў сучаснай лінгвістыцы. Аснова і корань. Тыпы асноў: аснова словаформы, аснова слова. Чляні́мыя / нечляні́мыя, вытворныя / невытворныя асновы. Перарваная і неперарваная асновы. Асновы простых і складаных слоў. Суплетыўны тып асноў. Поўны і частковы суплетывізм. Цяжкія выпадкі вызначэння асновы слова і асновы словаформы.

Гістарычныя змены ў марфемнай структуры слоў: апрошчанне, перараскладанне, ускладненне, дэкарэляцыя. Прычыны і характар гэтых з’яў у беларускай мове.

Марфемны аналіз слова, яго спецыфіка, прынцыпы і задачы. Фармальна-семантычны прынцып – аснова марфемнага аналізу. Адрозненне і ўзаемаадносіны марфемнага, словаўтваральнага і этымалагічнага аналізаў.

Марфемаграфія: марфемныя слоўнікі.

## МАРФАНАЛОГІЯ

Марфаналогія: тэрмін і паняцце. Аб’ект і задачы марфаналогіі як раздзела мовазнаўства. Сувязь марфаналогіі з фанетыкай, фаналогіяй, арфаэпіяй, марфемікай, словаўтварэннем, марфалогіяй, сінтаксісам, стылістыкай. Асноўныя адзінкі марфаналогіі, іх характарыстыка. Морфы, аламорфы, варыянты марфемы. Марфанема. Субморф і яго адносіны да морфа. Марфаналагічны рад.

Фанемная структура марфем. Структура каранёвых марфем слоў, якія належаць да розных часцін мовы. Структура афіксальных марфем.

Марфаналагічныя з’явы: чаргаванні (альтэрнацыя) гукаў у межах марфемы, чаргаванні фанем на стыку марфем, усячэнне асновы, нарашчэнне асновы (інтэрфіксацыя), накладанне (інтэрферэнцыя, аплікацыя, гаплалогія) морфаў, сцяжэнне.

## СЛОВАЎТВАРЭННЕ

Словаўтварэнне: тэрмін і паняцце. Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства. Прадмет, задачы і месца словаўтварэння сярод іншых лінгвістычных дысцыплін. Сувязь словаўтварэння з лексікалогіяй, фанетыкай, марфалогіяй і сінтаксісам. Сінхранія і дыяхранія ў словаўтварэнні.

Паняцце словаўтваральнай вытворнасці (матывацыі). Крытэрыі і паказчыкі вытворнасці. Фармальна-семантычная суадноснасць вытворнага слова з утваральным (матывавальным) словам як асноўны прынцып вытворнасці. Віды адносін вытворнасці паміж вытворным словам і ўтваральным (матывавальным) словам. Разыходжанні адносін фармальнай і сэнсавай вытворнасці. Непасрэдная і апасродкаваная вытворнасць. Адносіны множнай вытворнасці.

Вытворнае (матываванае) слова – аб’ект вывучэння ў словаўтварэнні. Уласцівасці вытворных слоў, іх фармальныя і семантычныя сувязі з утваральнымі словамі. Вытворнае і зыходнае (базавае, утваральнае, матывававальнае) слова як словаўтваральная пара, звязаная адносінамі словаўтваральнай вытворнасці. Словаўтваральны фармант як адзінка

словаўтваральнай сістэмы.
Словаўтваральная і марфемная структура слова. Суадносіны паняццяў падзельнасці (члянімасці) і вытворнасці слова.

Словаўтваральнае значэнне як асобы тып моўнага значэння. Адрозненне словаўтваральнага значэння ад лексічнага і граматычнага. Сродкі выражэння словаўтваральнага значэння вытворнага слова. Тыпы словаўтваральных значэнняў: транспазіцыйнае, мадыфікацыйнае, мутацыйнае.

Комплексныя адзінкі словаўтваральнай сістэмы, іх характарыстыка: словаўтваральная пара, словаўтваральны ланцужок, словаўтваральная парадыгма, словаўтваральнае гняздо.

Словаўтваральны тып і яго паняцце. Фармальныя і семантычныя прыметы словаўтваральнага тыпа. Прадуктыўнасць словаўтваральнага тыпа. Сінанімія, аманімія, антанімія словаўтваральных тыпаў.

Паняцце словаўтваральнай (марфаналагічнай) мадэлі.

Словаўтваральная катэгорыя як вынік узаемадзеяння сінанімічных словаўтваральных тыпаў.

Валентнасць (спалучальнасць) словаўтваральных марфем у слове. Семантычныя, стылістычныя, лексічныя, словаўтваральныя, фармальныя абмежаванні спалучальнасці словаўтваральных марфем.

Індывідуальна-аўтарская словатворчасць.

Спосаб словаўтварэння: тэрмін і паняцце. Спосабы сінхроннага словаўтварэння, іх класіфікацыя паводле характару словаўтваральных фармантаў: афіксальныя, бязафіксныя і змешаныя (камбінаваныя) спосабы словаўтварэння.

Афіксальныя спосабы словаўтварэння, іх разнавіднасці. Некамбінаваныя афіксальныя спосабы словаўтварэння: прэфіксальны, суфіксальны, нульсуфіксальны, постфіксальны.

Камбінаваныя афіксальныя спосабы словаўтварэння: прэфіксальна-суфіксальны (конфіксны, цыркумфіксны), прэфіксальна-нульсуфіксальны, прэфіксальна-постфіксальны, суфіксальна-постфіксальны, прэфіксальна - суфіксальна-постфіксальны.

Бязафікснае словаўтварэнне, яго асаблівасці.

Складанне як спосаб словаўтварэння, яго фармальна-структурныя разнавіднасці: словаскладанне, асноваскладанне. Абрэвіяцыя, яе асаблівасці. Віды абрэвіятур.

Змешаныя спосабы словаўтварэння як узаемадзеянне афіксальных і бязафіксных словаўтваральных сродкаў. Разнавіднасці змешаных спосабаў словаўтварэння: суфіксальна-складаны, скарачэнне (універбацыя, семантычная кандэнсацыя) з суфіксацыяй.

Адваротнае словаўтварэнне (рэдэрывацыя).

Прадуктыўнасць сінхронных спосабаў словаўтварэння.

Дыяхроннае словаўтварэнне ў беларускай мове. Спосабы дыяхроннага словаўтварэння: лексіка-семантычны, лексіка-сінтаксічны, марфалагічна-сінтаксічны. Разнавіднасці марфалагічна-сінтаксічнага словаўтварэння: субстантывацыя, ад’ектывацыя, адвербіялізацыя, пранаміналізацыя, нумералізацыя, прэпазіцыяналізацыя і інш. Прадуктыўнасць дыяхронных спосабаў словаўтварэння.

Паняцце словаўтваральнай нормы. Узаемадзеянне і канкурэнцыя словаўтваральных тыпаў. Словаўтваральная варыянтнасць. Актыўныя працэсы ў сістэме сучаснага беларускага словаўтварэння.

Словаўтваральны аналіз, яго спецыфіка, прынцыпы і задачы.

Словаўтваральныя слоўнікі. Адваротныя слоўнікі.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

| №п/п | Назвы раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Аўдыторныя | | | | Самаст. работа |
| | | Лекцыі | Практыч., семінар. | Лаб. заняткі | КСР | |
| 1. | Марфеміка. Сістэма марфем у мове | 10 | 12 | | 6 | |
| 2. | Марфаналогія | 2 | | | 2 | |
| 3. | Словаўтварэнне | 8 | 8 | | 4 | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў;<br>пералік пытанняў для вывучэння | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | кіруемая самастойная работа студэнта | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | **Марфеміка. Марфаналогія. Словаўтварэнне ( 52 г.)** | **20** | **20** | | **12** | | | |
| 1.1. | **Марфеміка. Сістэма марфем у мове (22 г.)** | **10** | **12** | | **6** | | | |
| 1.1.1. | 1. Паняцце тэрміна марфемікі; двухзначнасць тэрміна “марфеміка”<br>2. Прадмет і задачы марфемікі.<br>3. Сувязь марфемікі з іншымі раздзеламі мовазнаўства (фанетыкай, фаналогіяй, арфаграфіяй, лексікалогіяй, словаўтварэннем, марфалогіяй, сінтаксісам).<br>4. Асноўныя паняцці марфемікі.<br>5. Марфема як мінімальная значымая частка слоў (словаформ).<br>6. Месца марфемы ў сістэме адзінак розных узроўняў мовы: фанема і марфема, склад і марфема, слова і марфема, слова і марфема, словазлучэнне і марфема, сказ і | 2 | 4 | | 2 | Марфемны слоўнік Энцыклапе-дыя “Беларуская мова” | [1],[3], [11], [12], [19], [20]. | Пісьмовая работа |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | марфема.<br>7. Інтэгральныя і дыферэнцыяльныя прыметы марфемы ў параўнанні з іншымі адзінкамі мовы.<br>8. Каранёвыя і афіксальныя марфемы, іх асаблівасці і адрозненне.<br>9. Свабодныя і звязаныя карані.<br>10. Фармальна-семантычнае вылучэнне каранёвых марфем.<br>11. Цяжкія выпадкі вылучэння каранёвых марфем. | | | | | | | |
| 1.1.2. | **Класіфікацыя афіксальных марфем.**<br>1. Афікс: тэрмін і паняцце.<br>2. Класіфікацыя афіксальных марфем паводле месца ў складзе слова (словаформы) адносна кораня: перадкаранёвыя і паслякаранёвыя марфемы.<br>3. Фанемнае выражэнне марфем у мове. Матэрыяльна выражаныя (пазітыўныя) марфемы ў мове.<br>4. Нулявыя (матэрыяльна нявыражаныя) марфемы . Сістэма нулявых марфем у беларускай мове.<br>5. Характарыстыка афіксальных марфем: прыстаўка (прэфікс), суфікс, постфікс, інтэрфікс, конфікс (цыркумфікс), канчатак (флексія).<br>6. Пытанне аб інтэрфіксах, постфіксах і конфіксах (цыркумфіксах) у лінгвістычнай літаратуры. | 2 | 4 | | 2 | Марфемны слоўнік. Электронны падручнік. Камп’ютэр-ныя тэсты | [1],[ 5], [11], [12], [14], [20]. | Камп’ютэр-ны тэст |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 7. Тыпы афіксальных марфем паводле значэння і функцыі: словаўтваральныя (дэрывацыйныя), формаўтваральныя (словазменныя, рэляцыйныя) і словаформаўтваральныя (сінкрэтычныя ) афіксы.<br>8. Афіксоіды як марфемы пераходнага тыпу. Разнавіднасці афіксоідаў: прэфіксоіды, суфіксоіды.<br>9. Рэгулярныя і нерэгулярныя, прадуктыўныя і непрадуктыўныя афіксы. | | | | | | | |
| 1.1.3. | **Структурна-семантычныя ўзаемаадносіны афіксальных марфем у складзе слова**.<br>1. Аманімія афіксаў.<br>2. Полісемія (мнагазначнасць) афіксаў.<br>3. Сінанімія афіксаў.<br>4. Антанімія афіксаў.<br>5. Экспрэсіўна-стылістычныя функцыі марфем у мове. | 2 | | | 2 | Марфемны слоўнік. “Беларуская граматыка” | [1], [4], [10],[11]], [13]. | Пісьмовы тэст |
| 1.1.4. | **Аснова як абавязковы кампанент структуры слова**<br>1. Аснова: тэрмін і паняцце.<br>2. Прынцыпы выдзялення асновы слова і словаформы ў лінгвістычнай літаратуры.<br>3. Аснова і корань<br>4. Тыпы асноў: аснова словаформы, аснова слова, словаўтваральная аснова.<br>5. Члянімыя /нечлянімыя, вытворныя/невытворныя асновы.<br>6. Перарваная і неперарваная асновы. | 2 | 2 | | | Марфемны слоўнік. Электронны падручнік. Камп’ютэр-ныя тэсты | [5],[11], [12], [16] [20]. | Пісьмовы тэст |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 7. Асновы простых і складаных слоў.<br>8. Суплетыўны тып асноў. Поўны і частковы суплетывізм.<br>9. Цяжкія выпадкі вызначэння асновы слова і асновы словаформы. | | | | | | | |
| 1.1.5. | **Гістарычныя змены ў марфемнай структуры слоў.**<br>1. Апрошчанне, прычыны і характар гістарычнай з’явы ў складзе слоў (словаформ).<br>2. Перараскладанне, прычыны і характар гістарычнай з’явы ў складзе слоў (словаформ).<br>3. Ускладненне, прычыны і характар гістарычнай з’явы ў складзе слоў (словаформ).<br>4. Дэкарэляцыя, прычыны і характар гістарычнай з’явы ў складзе слоў (словаформ).<br>5. Марфемны аналіз слова, яго спецыфіка, прынцыпы і задачы. Адрозненне і ўзаемаадносіны марфемнага, словаўтваральнага і этымалагічнага аналізаў.<br>6. Беларуская марфемаграфія: марфемныя слоўнікі. | 2 | 2 | | | | [3], [4], [8], [11], [12] [14], [17]. | Самастой-ная работа |
| **2. 1** | **Марфаналогія (4 г.)** | **2** | | | **2** | | | |
| 2.1.1. | 1. Марфаналогія: тэрмін і паняцце. Аб’ект і задачы марфаналогіі як раздзела мовазнаўства.<br>2. Сувязь марфаналогіі з фанетыкай, фаналогіяй, арфаэпіяй, марфемікай, словаўтварэннем, марфалогіяй, стылістыкай.<br>3. Асноўныя адзінкі марфаналогіі, іх характарыстыка. Морфы, аламорфы, | 2 | | | 2 | Марфемны слоўнік. Словаўтвара-льны слоўнік Электронны падручнік. Камп’ютэр-ныя тэсты | [1—4], [8],[11,], [12]. | Пісьмовая работа |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | варыянты марфем.ю<br>4. Марфанема. Субморф і яго адносіны да морфа. Марфаналагічны рад.<br>5. Фанемная струтура каранёвых і афіксальных марфем.<br>6. Марфаналагічныя з'явы: чаргаванні (альтэрнацыя) фанем у межах марфемы, чаргаванні фанем на стыку марфем.<br>7. Усячэнне і нарашчэнне (інтэрфіксацыя) асновы .<br>8. Накладанне (інтэрферэнцыя, аплікацыя, гаплалогія) морфаў.<br>9. Фанемнае сцяжэнне морфаў. | | | | | | | |
| **3.** | **Словаўтварэнне (20 г.)** | **8** | **8** | | **4** | | | |
| **3.1.** | **Словаўтварэнне. Словаўтваральная вытворнасць (4 г.)** | **8** | **8** | | **4** | | | |
| 3.1.1. | **Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства.**<br>1. Прадмет і задачы, сувязь словаўтварэння з іншымі раздзеламі мовазнаўства.<br>2. Сінхранія і дыяхранія ў словаўтварэнні.<br>3. Паняцце словаўтваральнай вытворнасці. Крытэрыі і паказчыкі вытворнасці.<br>4. Фармальна-семантычная суадноснасць вытворнага слова з утваральным словам (асновай).<br>5. Віды адносін вытворнасці паміж вытворным словам і ўтваральным словам: непасрэдная і апасродкаваная вытворнасць.<br>6. Адносіны множнай вытворнасці.<br>7. Словаўтваральны аналіз, яго спецыфіка і задачы. | 2 | 2 | | | Хрэстаматыя па беларускай мове. Словаўтваральны слоўнік Электронны падручнік. | [1—4], [6],[7], [9], [10], [11], [15]. | Самастойная работа |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 8. Паняцце словаўтваральнага значэння, яго адрозненне ад лексічнага і граматычнага значэнняў. Сродкі выражэння словаўтваральнага значэння вытворнага слова.<br>9. Тыпы словаўтваральных значэнняў: транспазіцыйнае, мадыфікацыйнае, мутацыйнае | | | | | | | |
| 3.1.2. | **Комплексныя адзінкі словаўтваральнай сістэмы.**<br>1. Словаўтваральная пара.<br>2. Словаўтваральны ланцужок.<br>3. Словаўтваральная парадыгма.<br>4. Словаўтваральнае гняздо і яго структура<br>5. Словаўтваральны тып і яго паняцце. Прадуктыўнасць СТ.<br>6. Паняцце словаўтваральнай (марфаналагічнай) мадэлі.<br>7. Словаўтваральная катэгорыя як вынік узаемадзеяння сінанімічных словаўтваральных тыпаў.<br>8. Валентнасць (спалучальнасць) словаўтваральных марфем у мове. | 2 | 2 | | 2 | Словаўтвара-льны слоўнік Электронны падручнік. Камп’ютэр-ныя тэсты | [1], [11], [14], [18], [20]. | Самастой-ная работа |
| 3.1.3. | **Спосабы словаўтварэння.**<br>1. Спосабы сінхроннага словаўтварэння, іх класіфікацыя паводле характару словаўтваральных фармантаў: афіксальныя, бязафіксныя і змешаныя спосабы словаўтварэння.<br>2. Складанне як спосаб словаўтварэння, яго разнавіднасці: асноваскладанне, словаскладанне. | 4 | 4 | | 2 | Словаўтва-ральны слоўнік Электронны падручнік. Камп’ютэр-ныя тэсты | [1], [4],[6], [7], [11], [14], [20]. | Камп’ютэр-ны тэст |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Абрэвіяцыя, яе разнавіднасці. Віды абрэвіятур.<br>4. Адваротнае словаўтварэнне.<br>5. Прадуктыўнасць сінхронных спосабаў словаўтварэння.<br>6. Дыяхронныя с посабы словаўтварэння: лексіка- семантычны, лексіка-сінтаксічны, марфалагічна-сінтаксічны, іх характарыстыка. | | | | | | | |

## Асноўная і дадатковая літаратура

| №№ п/п | Спіс літаратуры | Год выдання |
|---|---|---|
| | **Асноўная** | |
| 1. | Беларуская граматыка. Ч.1. | Мн., 1985. |
| 2. | Беларуская мова ў 2-й палове ХХ ст | Мн., 1998. |
| 3. | Беларуская мова. Энцыклапедыя. | Мн., 1994. |
| 4. | Граматыка беларускай мовы. Т. 1. | Мн., 1962. |
| 5. | Карский Е. Очерки по белорусскому языку. Словообразование | М., 1956 |
| 6. | Лукашанец А.А. Словаўтварэнне і граматыка. | Мн., 2001. |
| 7. | Прыгодзіч М.Р. Словаскладанне ў беларускай мове. | Мн., 2000. |
| 8. | Русак В.П. Марфаналогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы | Мн, 2003. |
| 9. | Сцяцко П.У. Культура мовы. | Мн, 2002. |
| 10. | Сцяцко П.У. Праблемы нормы, культуры мовы | Гродна, 1998. |
| 11. | Шакун Л.М. Словаўтварэнне. | Мн, 1978 |
| 12. | Шуба П.П. Уводзіны ў граматыку беларускай мовы. | Мн., 1969. |
| | **Дадатковая** | |
| 13. | Герд А.С. Семантика морфем. | М., 1987. |
| 14. | Земская Е.А. Современный русский язык. Словообразование. | М., 1973. |
| 15. | Земская Е.А. Словообразование как деятельность. | М., 1992. |
| 16. | Виноградов В. В. Вопросы русского словобразования.// Виноградов В. В. Избранные труды по русскому словобразованию. | М., 1975. |
| 17. | Зверев А.Д. Словообразование в современных восточнославянских языках. | М., 1981. |
| 18. | Милославский И.Г. Вопросы словообразовательного синтеза. | М., 1980. |
| 19. | Лопатин В.В. Русская словообразовательная морфемика: Проблемы и принципы описания. | М., 1977. |
| 20. | Моисеев А.И. Основные вопросы словообразования в современном русском литературном языке. | М., 1987. |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца узгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| 1.Уводзіны ў агульнае мовазнаўства | Тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства | няма | Зацвердзіць Пратакол № 11 ад 11 чэрвеня 2012 г. |
| 2. Гістарычная граматыка | Гісторыі беларускай мовы | няма | |
| 3. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы | Гісторыі беларускай мовы | няма | |
| 4. Беларуская дыялекталогія | Гісторыі беларускай мовы | няма | |
| 5. Сучасная руская мова | Рускай мовы | няма | |

ДАПАЎНЕННІ І ЗМЯНЕННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
на _____/_____ вучэбны год

| №№ пп | Дапаўненні і змяненні | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры (пратакол № ____ ад ________ 20__ г.)

Загадчык кафедры

_________________________ _________________ _____________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта

_________________________ _________________ _____________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)